# Добрае слова святару

Аўтар: Парафіяне касцёла свсв. апосталаў Пятра і Паўла ў Іўі
26.06.2022 00:00



Складаная і няпростая гэта справа – выхоўваць вернікаў духоўна здаровымі і адказнымі.

Ксёндз Павел Калеснік за гэты нядоўгі час здолеў стаць для нас добрым пастырам.

Ён старанна вучыць ісці па шляху, які вядзе да паяднання з Богам, настаўляе няўмелых і падтрымлівае слабых, суцяшае засмучаных і наведвае хворых, бласлаўляе і моліцца за нас. Заўсёды падае прыклад глыбокай малітвы, мудрага слова і духоўнай моцы. Кожнае казанне пробашча насычана светлай любоўю да Бога, Радзімы, людзей. Словы святара напаўняюць на- шы сэрцы верай, надзеяй і любоўю да Пана Езуса Хрыста, за што мы яму вельмі ўдзячныя.

Наш пробашч – натура творчая, мэтанакіраваная. Усё ў яго атрымліваецца. Ён вельмі добры, чалавечны, інтэлігентны, мудры, справядлівы, цярплівы, старанны, безадказны, працалюбівы. З ім лёгка размаўляць.

А колькі мерапрыемстваў праводзіцца ў нашым касцёле! Яны не забудуцца, бо пакідаюць у сэрцах вернікаў глыбокі след.

Прыгожа і ўрачыста пробашч праводзіць хрышчэнне дзетак, удзяляе шлюб маладым. Не так даўно ў касцёле прайшло свята Першай Камуніі.

Гэта свята не толькі для дзяцей, якія першы раз прынялі Цела Езуса Хрыста ў свае сэрцы, але і для ўсёй нашай парафіі. Увогуле, усё, што ладзіцца ў касцёле, праводзіцца з вялікай любоўю і адказнасцю.

Трэба адзначыць таксама зладжаную работу святара і касцёльнага камітэта як пры падрыхтоўцы і правядзенні свят, так і ў штодзённым жыцці пры вырашэнні розных праблем. Хіба не ўдасца пералічыць усё, што праведзена і зроблена за такі кароткі час у нашым касцёле. А якія ў пробашча планы! Незразумела толькі, калі ён адпачывае, таму што кіраваць такой вялікай парафіяй аднаму вельмі цяжка.

**Добрае слова святару**

Аўтар: Парафіяне касцёла свсв. апосталаў Пятра і Паўла ў Іўі
26.06.2022 00:00

